

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис".
ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№17 (203). 26 красавіка — 2 траўня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 130 руб.

ВОЕННЫЕ ОТКРЫЛИ ДВЕРИ

21 АПРЕЛЯ, В СУББОТУ, 11 МЕХАНИЗИРОВАННАЯ БРИГАДА традиционно отмечала очередную годовщину своего создания

День части — это праздник не только для военных. В этот день бригада всегда широко открывает двери для всех желающих. Приходят и родители солдат, их друзья, жены и дети офицеров и прапорщиков, парни, которые скоро сами станут в строй. Всегда много почетных гостей, представителей городских властей, священнослужители, журналисты.

Так было и в этот раз. Командование бригады подготовило для своих гостей хорошую программу: выставку боевой техники, экспозицию музея военной формы одежды, показательные выступления с приемами рукопашного боя воинов-разведчиков, вальс на плацу учащихся кадетского класса СШ №9 и многое другое. Специально на праздник приехал бывший командир 11 бригады генерал-майор Анатолий Никитин.

В общем, было что посмотреть и о чем рассказать вам, дорогие читатели "ГС", но рассказать мы не сможем. Корреспондентов "ГС" еще до начала праздника отконвоировали за ворота бригады по приказу подполковника Белоконева, заместителя командира бригады. Мотивация — отсутствие приглашений. Хотя приглашение корреспонденты "ГС" получили устно еще месяц назад от полковника Валерия Кадевича, заместителя командира бригады по воспитательной работе.

Возможно, подполковник Белоконев обижен на корреспондента лично, но демонстрировать свои амбиции, тем самым лишая возможности читателей "ГС" получать достоверную информацию не стоило. День открытых дверей стал днем закрытых ворот для всех, не только для журналистов, но и для читателей.

Валерий КОВАЛЕНКО



Фота Віталя Гіля


Командир корпуса генерал Анатолий Никитин и комбриг Иван Чаус направляются на праздник

У АЛЕГА ЛОЙКІ – ЮБІЛЕЙ

1 траўня нашаму земляку, доктару філалагічных навук, прафесару, члену-карэспандэнту Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі Алегу Антонавічу Лойку спаўняецца 70.

Вечарына з гэтай нагоды адбудзецца 1 траўня ў Слонімскім РДК у 15.00. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Інтэрв'ю з юбілярам чытайце ў "ГС" у наступным нумары.



Фота Віталя Гіля

24 красавіка слонімцы, як і ўсе жыхары Беларусі, адзначалі Радаўніцу. У гэты дзень яны наведалі магілкі і памянулі памерлых сваякоў і сяброў. На здымку: жыхары Слоніма памінаюць сваіх продкаў на Ружанскіх могілках.

ЧЕЛОВЕК УМЕР, так и не дождавшись помощи у властей

На прошлой неделе в нашей редакции раздался очередной телефонный звонок. Звонившая женщина взволнованно рассказала: "У наших соседей беда: муж вот уже как полтора года лежит, прикованный к постели, его жена, инвалид 3 группы, у них двое детей. У этой семьи нет денег, чтобы сделать ремонт в квартире. В последнее время у них забился унитаз. Вызвали сантехников. Чтобы устранить неисправность, рабочие порекомендовали разбить унитаз. Согласиться с таким вариантом люди не могут из-за отсутствия денег на покупку нового. А в то время нечистоты протекают в квартиру этажом ниже. Придите — посмотрите, что у них творится". Звонок был в среду, 18 апреля. А в субботу, 21 апреля, как и договорились, пошли по указанному адресу. Улица К.Маркса, 50. Это очень старое двухэтажное строение, неприглядное, с деревянными лестницами. Дверь в квартиру открыла заплаканная, в черном платке женщина. "Не дождался он вас, хозяин наш, умер", — расплакалась Янина Антоновна Лагоша — хозяйка квартиры. — Сорок лет в нашей квартире не было ремонта. Я не могла его сделать, так как очень серьезно больна, а мой муж вообще лежал, прикованный к постели".

Оказывается, что этой семье не положено никаких льгот. По словам Янины Антоновны, ей объяснили, что, если в семье есть хотя бы один трудоспособный человек (а она, чтобы прокормить семью, работает уборщицей на мебельной фабрике), то все льготы отменяются.

"Помощи от властей — никакой. Нам должны были поставить телефон, так как муж был инвалидом 1 группы, но все откладывали на потом. А теперь, когда муж умер, нам точно не поставят телефон, так как вроде бы уже и не положено, — с горечью сказала Янина Антоновна. — А унитаз нам так и не пробили. Пришло письмо из ЖЭСа, в котором говорилось, что мы должны дать согласие на то, чтобы его разбить. После чего мы должны за свои деньги установить новый. Но откуда у нас деньги? Мне и мужа не за что похоронить, хорошо, что хоть люди добрые рядом есть". Высказалась женщина и расплакалась: "Я не знаю, как дальше жить, как мне вырастить двух детей?".

Я поняла, что Янина Антоновна уже перестала надеяться на помощь наших властей.

А 63-летний Анатолий Лагоша умер, так и не дождавшись элементарной помощи: унитаз в квартире до сих пор не починили.

Ольга ШИНКЕВИЧ



Фота Віталя Гіля

В день похорон Анатолия Лагоши

ФОНД АБНАВІЛІ

У суботу, 21 красавіка, у Мінску прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя рэспубліканскай грамадскай арганізацыі Фонд імя Льва Сапегі, дзе быў абраны новы старшыня Аляксандр Жучкоў, а ў абноўлены склад праўлення сярод іншых увайшлі Міхась Варанец са Слоніма і Мікалай Кавальчук з Ваўкавыска.

У адрас былога старшыні Фонду Міраслава Кобуса на канферэнцыі прагучала некалькі папрокаў за бяздзейнасць у справе усталявання помніка Льву Сапегу ў Слоніме. Нагадаем, што яшчэ ў 1999 годзе мясцовыя ўлады прынялі рашэнне аб усталяванні ў горадзе помніка Сапегу. Але ў арганізатараў праекта тады ўзніклі пэўныя непаразуменні з аўтарам помніка скульптарам Іванам Міско, а таксама фінансавыя праблемы. У выніку, помніка Сапегу ў нашым горадзе дасюль няма. Аднак са зменай кіраўніцтва Фонду, аднаго з асноўных арганізатараў і выканаўцаў праекта, з'явілася надзея, што пытанне з помнікам нарэшце зрушыцца з мёртвай кропкі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ по Гродненской области

У бліжэйшыя дні месцамі туман, вецер слабы. Тэмпература паветра ноччу +4+9, днём +9+15.

Облгидрометеоцентр

ЯШЧЭ АДНА АКЦЫЯ "ЗУБРОЎ"


Фота Віталя Гіля

У нядзелю, 22 красавіка, на слонімскім рынку сябры руху "Зубр" правялі акцыю пад назвай "Канчатковы дыягназ".

Маладыя людзі, пераапранутыя ў белыя халаты, раздавалі ўсім жадаючым спецвыпуск газеты "Наша свабода", дзе быў змешчаны артыкул урача-псіхіятра Дз.Шчыгельскага адносна здароўя Аляксандра Лукашэнкі. Сланімчане вельмі хутка разабралі ўсе газеты.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

ЛИКВИДАЦИЯ СВАЛОК ПРОШЛА НА ГРОДНЕНЩИНЕ

176 несанкционированных свалок мусора и выбросов ликвидировали природоохранные службы в Гродненской области в первом квартале этого года. Одновременно от мусора было убрано 1106 гектаров земли в пригородных и лесопарковых зонах.

За нарушение правил рационального использования земель и санитарного состояния территорий в области с нарушителей взыскано почти 2 миллиона рублей. Всего за первый квартал 2001 года природоохранные службы Гродненской области провели 785 оперативных проверок экологического состояния предприятий и хозяйств области, в ходе которых было составлено 205 протоколов на злостных нарушителей и выдано 835 предписаний по ликвидации выявленных недостатков.

Павел МОЖЕЙКО

РОСТ БОЛЬНЫХ РАСТЕТ

В этом году в Гродненской области, по сравнению с 1999 годом, на 40 процентов увеличилось число заболеваний щитовидной железы. Наблюдается также значительный рост у жителей области числа заболеваний эндокринной системы, злокачественных и доброкачественных опухолей.

Такие данные на пресс-конференции в Гродно, посвященной мерам по минимизации последствий аварии на Чернобыльской АЭС, привела начальник Гродненского областного управления здравоохранения Галина Прокопович. Однако, отметила она, в то же время на Гродненщине отмечено снижение общего количества заболеваний у населения.

На пресс-конференции выступил также Александр Алешин, начальник отдела облисполкома по чрезвычайным происшествиям и защите населения от последствий аварии на ЧАЭС. По его словам, в Гродненской области на загрязненной территории находится 150 населенных пунктов Ивьевского, Дятловского, Новогрудского и Кореличского районов. В этих населенных пунктах проживают 25 687 человек, из них 5 820 детей. За 15 лет после аварии в Гродненскую область из "зоны" отселения переехало 4,5 тысячи семей, что составляет примерно 16 тысяч человек. Последние три года в область не приехало практически ни одного переселенца. К тому же зафиксированы факты возвращения переселенцев в чернобыльскую "зону". В некоторых поселках количество тех, кто выехал, составляет от 10 до 20 процентов. Однако, по словам Алешина, многие из переселенцев возвращаются в "зону" "не потому, что любят свою родину, а для того, чтобы заработать денег, продав бесплатные квартиры, выделенные для них на Гродненщине государством".

Павел МОЖЕЙКО

15 – ЗА ВЕСЬ СЛОНИМ

В прошлый четверг в актовом зале горисполкома выбирали делегатов на II Всебелорусское народное собрание.

Согласно разнарядке от города Слонима нужно было выдвинуть 15 человек, в состав которых должны входить представители органов власти, промышленных предприятий, строительных организаций, предпринимательства, здравоохранения, образования, военнослужащих, общественных организаций и руководители политических партий.

Собрание прошло очень быстро. В полчаса избрали президиум, познакомились с предлагаемыми кандидатами и проголосовали по каждому из них.

В результате редкого единогласия выбрали 15 делегатов. От органов власти – 4: Олег Лактюшин, председатель Слонимского горисполкома, Анатолий Белянин, зам. председателя Слонимского горисполкома, Виктор Черный, зам. председателя Гродненского облисполкома и Леонид Мальцев, министр обороны РБ.

От промышленных предприятий – 4: Геннадий Бондарев, машинист цеха картона КБЗ, Тамара Житкевич, директор фабрики "Текстильщик", Светлана Жук, швея фабрики художественных изделий, Нина Тихончук, начальник цеха КПФ.

От строительных организаций – 1, Константин Хижинский, прораб МПМК-164. От предпринимательства – Николай Дубровский, директор фирмы "Зодчий". От здравоохранения – Георгий Лабович, и.о. главврача Слонимского ТМО. От образования – Олег Леонович, учитель истории СШ №7. От военнослужащих – Иван Чаус, командир 11 механизированной бригады. От общественных организаций – Светлана Еромчик, 1-й секретарь Слонимского отделения БПСМ. От политических партий – Александр Кириченко, 1-й секретарь городской организации КПБ.

Теперь выбранных делегатов ждет поездка в Гродно, чтобы выработать там на собрании "общую политику". А попросту – получить указания, какие вопросы можно будет поднимать, а какие – нет.

Валерий КОВАЛЕНКО

44 ТЫСЯЧИ ЧЕЛОВЕК
находятся в заключении

За три месяца 2001 в суды Беларуси поступило 10 тысяч 300 уголовных дел, подлежащих пересмотру в связи со вступлением в силу нового уголовного законодательства.

Об этом 18 апреля во время встречи с журналистами сообщил председатель Верховного суда Беларуси Валентин Сукало.

Напомним, что с 1 января 2001 года в Беларуси вступили в силу новые Уголовный, Уголовно-процессуальный и Уголовно-исполнительный кодексы. Из них, по словам Валентина Сукало, 2 тысячи 857 дел поступило в районные суды и 7 тысяч 443 – в областные.

Как сообщил председатель Верховного суда, в настоящее время судами уже рассмотрено 3 тысячи 605 уголовных дел. В результате от наказания были освобождены 1 тысяча 261 человек. Еще 506 заключенным ранее вынесенное наказание смягчено, а в отношении 605 изменен вид режима колонии. При этом Валентин Сукало отметил, что в первую очередь пересмотру подлежат уголовные дела, по которым заключенные подлежат немедленному освобождению. "Там, где смягчающие последствия могут подождать, эти дела будут рассмотрены несколько позднее", – сказал председатель Верховного суда. Он считает, что "эта работа будет продолжаться еще достаточно длительный период времени".

Валентин Сукало отметил также следующее: несмотря на существующие опасения, что смягчение уголовного законодательства приведет к росту преступлений, за три месяца 2001 года их общее количество снизилось на 9 процентов.

Всего же, по данным Сукало, в местах лишения свободы сейчас находится 44 с половиной тысячи заключенных.


Юрий ПОТЕМКИН

ЗАВЯРШЫЎСЯ ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН

Слонімскі беларускі драматычны тэатр завяршае свой 11-ты тэатральны сезон. У сувязі з гэтым карэспандэнт "ГС" узяў інтэрв'ю ў дырэктара тэатра Мікалая Лішыка і галоўнага рэжысёра Віктара Бутакова, якія нядаўна працуюць у тэатры.



Мікалай ЛІШЫК, *дырэктар:*


Фота Віталя Гіля

– Шчыра кажучы, тэатр для мяне – гэта нешта новае. Хаця культуру і мастацтва я ведаю добра, сам не раз выступаў на сцэне. На першай сустрэчы з калектывам тэатра пачуў шмат цікавых і арыгінальных пытанняў. Я задаволены, што не згубіўся сярод творчых людзей, якія – прафесіяналы сваёй справы. Амаль разам са мною прыйшоў у тэатр вопытны рэжысёр. Таму агульнымі намаганнямі будзем ісці наперад.

– З якімі першымі праблемамі Вы сутыкнуліся, працуючы на новай пасадзе?

– Свае праблемы і задачы з галоўным рэжысёрам мы для сябе вызначылі самыя. Адна з задач – неабходна "ісці ў людзі", гэта значыць, паказваць сябе, свае спектаклі не толькі ў Беларусі, а і за мяжою, на вялікіх тэатральных фестывалях. Асабліва даросыя пастаноўкі. Другая праблема – як пабудаваць у Слоніме тэатр. Скажу, што ёсць дамоўленасць з міністрам культуры аб выдзяленні 50% фінансаў на пабудову тэатра з рэспубліканскага бюджэту, 30% павінен выдзеліць аблвыканкам і па 10% – слонімскія раённы і гарадскі выканкамы. Як будзе на справе – пакажа час.

І яшчэ. Тэатру павінна дапамагаць рэклама. Рэклама не толькі ў прэсе, але і па ўсім нашым горадзе. Павінны ў мікараёнах быць рэкламныя тэатральныя шыльды, каб любы жыхар Слоніма змог прачытаць, калі і які будзе ў нас спектакль. Тэатр трэба рэкламаваць і ў інтэрнэце. Але ўсё гэта будзе залежаць не толькі ад дырэктара і галоўнага рэжысёра, але і ад калектыва ў цэлым, а таксама ад эканамічнай сітуацыі ў краіне.

Віктар БУТАКОЎ, *галоўны рэжысёр:*


Фота Віталя Гіля

– Для мяне асабіста, 11 тэатральны сезон стаў першым у Слоніме. У верасні мінулага года я ўпершыню прыехаў сюды, пачаў працаваць рэжысёрам у тэатры. Паставіў восенню спектакль "Пакуль яна памірала..." па п'есе Надзеі Птушкінай. А нядаўна ажыццявіў пастаноўку драмы Альбера Камю "Непаразуменне". Акрамя гэтых двух спектакляў у мінулым сезоне юныя гледачы ўбачылі "Зімовую казку" і "Дзень нараджэння".

– Віктар Фёдаравіч, дзе Вы жылі і працавалі да прыезду ў Слонім?

– Я працаваў акцёрам у тэатрах Расіі, а таксама рэжысёрам Брацкага драматычнага тэатра. Да прыезду ў Слонім, я быў галоўным рэжысёрам Усць-Каменагорскага рускага абласнога драматычнага тэатра Усходне-Казахстанскай вобласці.

– Чым парадуе Слонімскі тэатр сваіх гледачоў у наступным сезоне?

– У нядзелю, 29 красавіка, у нашым тэатры закрыццё сезона, хаця тэатр яшчэ будзе працаваць да свайго летняга водпуску. У новым сезоне гледачы ўбачаць найперш спектакль "Чужыя грошы" па п'есе Уладзіміра Бутрамеева і казку "Кот у ботах", а таксама іншыя пастаноўкі. Гледачоў мы па-ранейшаму будзем радаваць сваім тэатральным мастацтвам.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАШ ГОРАД

Слонімскія святлафоры


Фота Віталя Гіля

Першы святлафор у Слоніме з'явіўся на перакрыжаванні Чырвонаармейскай і Шасэйнай вуліц у 1966 годзе. Ён вісеў на канатах пасярэдзіне вуліц і рэгуліраваў рух машын і людзей. Другі святлафор быў прымацаваны на перакрыжаванні Камуністычнай вуліцы і Пушкіна ў 1967 годзе.

Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміў дырэктар Слонімскага спецыялізаванага мантажна- эксплуатацыйнага прадпрыемства ДАІ Андрэй Крупнік. Андрэй Мікалаевіч аказаўся цікавым субяседнікам, які добра ведае сваю справу. З яго слоў стала вядома, што цяпер у Слоніме налічваецца 10 святлафораў, ці больш правільна сказаць, 10 святлафорных аб'ектаў. Каб сёння набыць святлафорную апаратуру, трэба заплаціць каля 10 тысяч даляраў, а сам святлафор каштуе 900 даляраў. Абслугоўванне аднаго святлафора абыходзіцца ў месяц каля 128 тысяч рублёў, а замена адной лінзы (шкельца) каштуе 9 тысяч рублёў.

— Пры такіх вялікіх выдатках ад святлафораў можна адказацца ў Слоніме? — спытаў я ў Андрэя Крупніка.

— Не, ні ў якім разе. Калі мы адмовімся ад святлафораў, прыбавіцца ў Слоніме колькасць вулічных здарэнняў, пачнецца затрымка транспарту на вуліцах горада. Напрыклад, гарадскія аўтобусы без святлафораў скасуюць па два дзённых рэйса, а гэта таксама для гараджан не падарунак. Святлафоры ў Слоніме працуюць з 6.00 да 22.00, а некаторыя — з 8.00 да 20.00, — сказаў Андрэй Крупнік.

— Дзе яшчэ неабходна ўстанавіць у Слоніме святлафоры?

— Найперш, на скрыжаванні Студэнцкай і Камуністычнай вуліц, каля пажарнай часці, а таксама на Брэсцкай вуліцы, каля ПТВ-129. Але для гэтага неабходны вялікія грошы, а іх у бюджэце горада няма.

— Андрэй Мікалаевіч, ці часта б'юць і псуюць у нашым горадзе святлафоры?

— Бывае. Але найчасцей за ўсё выкручваюць са святлафораў лямпачкі. Пасля велікодных свят нам прыйшлося памяняць 43 лямпачкі. Іх выкручваюць як дарослыя, так і дзеці. І найперш з чырвонага святла, што вельмі небяспечна для вадзіцеляў і пешаходаў. За гэтым сочаць не толькі нашыя работнікі, але і супрацоўнікі ДАІ. Праз вашу газету хачу папярэдзіць, што ўсе тыя, хто псуе святлафоры і дарожныя знакі, будуць караццa штрафам, — папярэдзіў Андрэй Крупнік.

У кампетэнцыю Слонімскага спецыялізаванага мантажна-эксплуатацыйнага прадпрыемства ўваходзіць таксама абслугоўванне святлафораў і дарожных знакаў у Зэльве і ў Дзятлаве. У Зэльве, праўда, святлафораў няма, а ў Дзятлаве — толькі адзін. Што датычыць дарожных знакаў, дык іх у Слоніме аж 4.200. Прадпрыемства, якое ўзначальвае Андрэй Крупнік, само вырабляе іх, устанаўлівае і абслугоўвае. За месяц у Слоніме прыходзіцца мяняць каля 160 дарожных знакаў, выраб аднаго каштуе 20 даляраў. Але і тут не абыходзіцца без праблем. Шкоду гарадскім дарожным знакам наносіць моладзь. Асабліва ў летні перыяд, калі юнакі і дзяўчаты вяртаюцца з дыскатэк. Па дарозе яны ламаюць знакі, размалёўваюць іх фарбаю. Часцей за ўсё гэта здараецца на Брэсцкай і Тапалёвай вуліцах. А на Мінскім тракце нядаўна зніклі ўсе дарожныя знакі. А калі іх не чапаць, яны могуць прастаяць і сто гадоў, — сказаў Андрэй Крупнік.

Сяргей ЧЫГРЫН

СПАДЧЫНА — ПРАЗ СУД

Яшчэ ў 1983 годзе выйшла пастанова Міністэрства камунальнай гаспадаркі Беларусі аб інвентарызацыі жылога фонду на вёсцы.

Праводзілі інвентарызацыю ў населеных пунктах сельскіх саветаў з 1983 па 1990 год мясцовыя БТІ (Бюро тэхнічнай інвентарызацыі), у абавязкі якіх уваходзіў перапіс дамоў, абмер прысядзібных зямельных надзелаў, рэгістрацыя іншых пабудоў і іх уладальнікаў. Але да пачатку 90-ых гадоў па ўсёй Беларусі нерухомасць у вёсцы і яе фактычных уладальнікаў перапісаць не паспелі. А тут якраз пачалася прыватызацыя, на якую "пераключыліся" БТІ. Пра незавершаную інвентарызацыю, як гэта ў нас часта бывае, забыліся. Да часу. Бо ў 2000 годзе ў натарыяльныя канторы "зверху" паступіла ўказанне: ніякіх іншых дакументаў на права ўладання нерухомай маёмасцю ў вёсцы, акрамя даведкі БТІ, не прымаць. А адкуль узяцца той даведцы, калі інвентарызацыя не была зроблена?

Правільна, цяпер чалавек сам павінен звяртацца ў БТІ, каб яны ўсё праверылі-абмерылі і выдалі неабходную паперку, з якой можна пайсці да натарыуса і аформіць, напрыклад, спадчыну. Калі ўладальнік жывы. Калі ж чалавек пры жыцці пра гэта не паклапаціўся, то пасля яго смерці нашчадкам у БТІ такой даведкі не дадуць, бо ёсць інструкцыя, згодна якой уладальнік павінен прадаставіць пашпарт. А які ж пашпарт у нябожчыка?

Такім чынам, чалавек не можа набыць правы на спадчыну, бо натарыяльная кантора не аформіць яму дакументы без даведкі БТІ. Кола, што называецца, замыкаецца. І наступная арганізацыя, куды вымушаны звяртацца небарака, каб прызналі яго правы, гэта суд. Ды ў судзе — іншая нечаканасць. Там, натуральна, прымаюць заяву і разглядаюць справу, але за ўсё гэта чалавек павінен заплаціць дзяржпошліну ў памеры 5% ад інвентарнага кошту спадчыны (дома, участка і г.д.). І такая цана часта бывае не па кішэні людзям. Але нічога іншага не застаецца, і яны звяртаюцца ў суд.

Па словах суддзі слонімскага суда Тамары Хамінец, за мінулы год было разглядана не менш сарака такіх заяў, а за тры месяцы бягучага года — ужо больш за сорак. Улічваючы бюракратычную блытаніну існуючых інструкцый і недасканаласць сённяшняга заканадаўства ў частцы ўступлення ў правы спадчыны, суддзі выносяць рашэнне, паводле якога спадчыннік плаціць не 5% дзяржпошліны, а столькі, колькі каштавала б афармленне дакументаў у БТІ. Але нават псіхалагічна па некалькі разоў наведваць суд, каб уступіць у правы спадчыны, — для чалавека цяжка. Не кажучы ўжо пра тое, што суддзяў завальваюць справамі, якія маглі б вырашыцца ў іншым месцы. А для гэтага людзям проста своечасова патрэбна падумаць пра сваіх блізкіх.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

Абакралі магазін

Невядомыя асобы ўзламалі столь і залезлі ў магазін вёскі Вусце Дзятлаўскага раёна.

Злодзеі вынеслі рознага дабра на суму 140 тысяч рублёў.

Бяда напаткала на вуліцы

У пасёлку Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна грамадзянін Т. не справіўся з кіраваннем аўтамабіля і ўрэзаўся ў дрэва.

Вадзіцель атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму, сатрасенне мозга і моцна параніў твар.

Узяў і не аддаў

Жыхар пасёлка Наваельня, што ў Дзятлаўскім раёне, грамадзянін М. пазычыў знаёмаму 7 тысяч даляраў.

Мінула чатыры гады, але даўжнік вяртаць грошы не збіраецца. Мужчына звярнуўся ў міліцыю.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Дорожных аварий стало больше

Почти в два раза, по сравнению с 2000 годом, увеличилось количество дорожно-транспортных происшествий (ДТП) со смертельным исходом, происшедших в Гродненской области с начала нынешнего года.

Такие данные распространил пресс-центр УВД Гродненского облисполкома. За прошедшие три с половиной месяца этого года в области в результате ДТП погиб 41 человек, а за такой же период 2000 года — 21 человек.

Павел МОЖЕЙКО

"ТРЕТИЙ АНГЕЛ ВОСТРУБИЛ,

и упала с неба большая звезда, горящая подобно светильнику, и пала на третью часть рек и на источники вод. Имя сей звезде полынь; и третья часть вод сделалась полынью, и многие из людей умерли от вод, потому что они стали горьки".

(Откровение св. Иоанна Богослова, 8:10,11)

Полынной этой горечью отравлена вся жизнь Беларуси на протяжении вот уже 15-ти лет. 26 апреля 1986 года упала на нашу землю радиоактивная "звезда" Чернобыля и выжигает — незаметно, но беспощадно — ВСЁ.

И мы пьем этот яд ежеминутно и ежесекундно. Я не только о радиации говорю. Яд — и в забвении, замалчивании, привычке. Да, мы привыкли. Ведь вот же 15 лет после той катастрофы прошло, а мы — живем. И вроде бы ничего ужасного за это время не произошло.

А кто вам сказал, что мы живем? Может быть, мы доживаем. И откуда вы знаете, что страшного ничего не случилось? Ведь по старой "совковой" привычке от нас зачастую многое скрывают. А если и обнародуют какие-нибудь нехорошие цифры, то смело можно умножать их в несколько раз, чтобы реальную картину происходящего себе представить.

А нам и представлять-то не хочется. Не до того как-то. Что нам 60% заболеваний щитовидной железы у школьников? Мелочи... Что нам увеличение количества раковых заболеваний, заболеваний сердечно-сосудистой системы, больных туберкулезом? Авось, пронесет как-нибудь... Смертность повысилась? Да вроде обычная, хотя всякий раз, приходя на кладбище, ловим себя на мысли: "Люди мрут как мухи"... Рождаемость низкая? Так это все вопросы к женщинам, они рожать не хотят. А вы спросите у них, почему. Самым популярным, наверное, будет ответ: "Нечего нищету плодить". Но есть и еще один ответ.

Я и сам не так давно и совершенно случайно узнал, что в Слонимской больнице еще в прошлом году (не знаю, правда, как сейчас) с акушерок и врачей родильного отделения брали подписку о неразглашении сведений о состоянии здоровья новорожденных. Потому что, если оценивать здоровье родившихся по пятибальной системе, то на 5 — единицы и мало кто — на 4... Вот вам и здоровье нации, вот вам и взгляд в будущее.

Насколько все это может быть связано с Чернобылем, я не знаю. Но уж слишком быстро растет воздействие Человека на Природу. С начала XX века ученые начали говорить о вступлении в эру Разума, в результате чего развитие всей планеты станет направленным и направляемым силой Разума. Но направляемым в интересах Человека, его будущего!

100 лет прошло. Целый век! Человечество шагнуло в третье тысячелетие, а все остается по-прежнему. Человек уничтожает среду своего обитания, и это не игра случая.

Способно ли будет наше общество поставить свое развитие в определенные рамки, подчинить его тем или иным условиям? Процесс этот, судя по всему, будет долгим и мучительным, процесс выработки новых принципов в согласовании своих действий и нового поведения людей. Другими словами, новой нравственности, коренной перестройки всего нашего бытия, смены стандартов и идеалов.

Однако, похоже, что сегодня случайность и неопределенность правят миром. Но будущее всегда зависит от прошлого. И третий Ангел уже вострубил...

Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНЫ

Госці з Мінска прыехалі з кнігамі

У нядзелю, 22 красавіка, Слонімшчыну і Зэльвеншчыну наведалі вядомыя беларускія пісьменнікі, гісторыкі, журналісты і медыкі.

Мінчане пабывалі ў рэдакцыі нашай газеты, наведалі Сынковіцкую царкву, Жыровічы, пазнаёміліся з архітэктурнымі помнікамі Слоніма. Гісторык і пісьменнік Уладзімір Арлоў падараваў бібліятэкам нашага горада свае кнігі "Дзевяць вякоў беларускай гісторыі" і "Адкуль наш род".

Ёсць у Гудзевічах музей

Хлопчыкі і дзяўчынкі, якія наведваюць гурткі юных журналістаў і гісторыкаў, што дзейнічаюць пры грамадскай арганізацыі "Воля да развіцця", пабывалі на экскурсіі ў вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна.

Вёска гэта знакаміта тым, што там ужо шмат гадоў дзейнічае літаратурна-этнаграфічны музей, які арганізаваў адраджэнец беларускай справы Алесь Белакоз. Музей уражвае багатымі экспанатамі, якія расказваюць пра гісторыю і літаратуру нашай бацькаўшчыны.

Крымінал мігрыруе

За першыя тры месяцы па лініі крымінальнага вышуку колькасць злачынстваў у Слоніме, у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, знізілася на 14,9 працэнта, у Зэльве — на 3,3 працэнта.

А вось у Мастоўскім раёне, наадварот, колькасць крымінальных злачынстваў за гэты перыяд часу павялічылася на 135,7 працэнта, а ў Дзятлаўскім раёне — на 75 працэнтаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Першая кніжка Міколы Грышана

Аўтар свайго першага паэтычнага зборніка "Вернасць" жыве ў Дзятлаве. Раней працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Раготнаўскай сярэдняй школе.

Вершы Мікалай Паўлавіч піша даўно. Яны друкаваліся ў розных рэспубліканскіх выданнях. Кніжка ж паэта ўбачыла свет, дзякуючы падтрымцы Гродзенскага грамадскага аб'яднання "Ратуша".

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Вандроўка юных мастакоў

Група гуртжоўцаў старшакласнікаў, сумесна з сябрамі студыі выяўленчага мастацтва Цэнтра творчасці дзяцей і юнацтва, 21-22 красавіка наведала Мінск.

Яны пазнаёміліся з архітэктурай сталіцы, наведалі Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава і Беларускую акадэмію мастацтваў. Сустрэліся з мастакамі Васілём Вышукавым і Андрэем Валатовічам. Дзеці таксама наведалі творчую майстэрню нашага земляка, знакамітага беларускага скульптара Івана Якімавіча Міско. Вандроўка пакінула самае прыемнае ўражанне ў юных мастакоў.

Яўген ІВАНОЎ

Першы экзамен "Творчасці"

У памяшканні рэдакцыі "ГС" змешчана выстава карцін мастакоў з гуртка "Творчасць".

Усе жадаючыя могуць наведаць нашу рэдакцыю і паглядзець на творы юных талентаў. Кіраўнік гуртка Таццяна Салыга.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

ПОСЛЕДСТВИЯ ЧЕРНОБЫЛЯ

Около 50 тысяч человек, переживших чернобыльскую катастрофу в возрасте до четырех лет, рискуют заболеть раком щитовидной железы.

Об этом заявил президент ландтага германской земли Нижняя Саксония, профессор Рольф Вернштедт, выступая 18 апреля на пленарном заседании V международного конгресса "Мир после Чернобыля" в Минске.

Он отметил, что люди, 15 лет назад подвергшиеся риску радиоактивного облучения, продолжают ежедневно употреблять зараженные продукты питания, которые по-прежнему поступают в торговую сеть. У взрослых, по данным немецкого профессора, значительно возрос уровень генетических заболеваний, а также заболеваемости диабетом, раком щитовидной железы, легких, желудка и крови. Заметно участились случаи ослабления иммунной системы, особенно у детей, и уродств у новорожденных. Многие женщины решаются на прерывание беременности из-за уродств, диагностируемых у плода. По прогнозам профессора Вернштедта, в ближайшие десятилетия ожидается значительный рост хронических и раковых заболеваний внутренних органов и костей.

Ученый подчеркнул, что программы государственных учреждений Беларуси не могут решить всех чернобыльских проблем из-за "удручающей" экономической ситуации в стране. Профессор выразил надежду на то, что мировое сообщество поддержит гражданскую активность людей, которые в зараженных районах проявляют волю к выживанию.

Коснувшись темы международной солидарности с жертвами Чернобыля, Рольф Вернштедт, который, кстати, является членом наблюдательного совета земельного фонда "Дети Чернобыля", сообщил: в Нижней Саксонии действуют около 80 чернобыльских инициатив. За прошедшее десятилетие здесь отдохнули и укрепили здоровье около 30 тысяч белорусских детей, на что было израсходовано примерно 30 миллионов немецких марок. Кроме того, фонд передал Беларуси 120 аппаратов УЗИ, а также лекарства и расходные материалы на сумму 2,3 миллиона немецких марок.

БелаПАН



Фота IREX/ProMedia

ЧИГИРИ ПОДАЛИ В СУД

Рассмотрение иска Юлии и Михаила Чигиря к журналистам Национальной телерадиокомпании Беларуси, которое 19 апреля началось в суде Первомайского района Минска, перенесено на 6 августа.

Судья Анатолий Анискевич удовлетворил ходатайство юридических представителей журналистов Белорусского телевидения Дмитрия Костина, Юрия Прокопова, ведущего программы "Права человека: взгляд в мир" Евгения Новикова (которые сами в суд не явились) о переносе рассмотрения иска.

В иске содержалось требование опровергнуть лживые и клеветнические, по мнению истцов, сведения, сопряженные с обвинениями в совершении преступлений, которые содержались в репортажах БТ от 11, 12 и 13 февраля 2001 года. Телевизионные передачи были посвящены аресту сына Михаила Чигиря Александра, который в эфире неоднократно был назван вором. Хотя виновность человека в совершении преступления устанавливает лишь суд. В этих передачах в подобном же ключе говорилось и об остальных членах этой семьи.

Представители журналистов БТ заявили о том, что они направили запросы по делу Александра Чигиря в КГБ, МВД, ГАИ и другие инстанции. На сегодняшний день ответов на эти запросы еще не получено. Как отметила Юлия Чигирь, ответчики надеются, что до 6 августа следствие найдет какие-либо подтверждения вины Александра Чигиря. И это косвенно подтверждает, что на сегодняшний день таких фактов у них нет и прозвучавшие по Белорусскому телевидению обвинения ни на чем не основаны.

Геннадий БАРБАРИЧ

БЕЛАРУСЫ РВУТ ЗА ГРАНИЦУ

В прошлом году 11.443 гражданина Беларуси оформляли документы на выезд за рубеж на постоянное место жительства. В этот же период на ПМЖ в республике было оставлено 18.517 граждан иностранных государств и 985 лиц без гражданства.

Такие данные привел на пресс-конференции в Минске начальник управления паспортно-визовой службы Министерства внутренних дел Беларуси полковник Сергей Стесик.


Большинство белорусских граждан – 4.019 – собирались переехать на постоянное место жительства в Россию, 2.621 – в Израиль, 1.651 – в США, 1.165 – на Украину, 1.015 – в Германию, 255 – в Италию, 100 – в Литву.

1.300 граждан России переехали на ПМЖ в Беларусь. Среди представителей других государств, пожелавших обосноваться в республике, наряду с гражданами стран афро-азиатского региона, стоит назвать 7 граждан США, 3 – Канады, по одному – Великобритании и Японии. Всего, по данным С.Стесика, в настоящее время на учете в органах внутренних дел республики состоят 115 тысяч постоянно проживающих в Беларуси иностранных граждан и лиц без гражданства.

Вячеслав БУДКЕВИЧ

НЕ ПОМОЖЕШЬ — СЯДЕШЬ В ТЮРЬМУ

В ходе прошедшего в Минске общереспубликанского селекторного совещания по вопросу проведения весенних полевых работ президент Беларуси Александр Лукашенко призвал нефтяные кампании вкладывать в его избирательную кампанию.


Фота IREX/ProMedia

Вот только некоторые цитаты Лукашенко, прозвучавшие в ходе совещания.

"Валерий Иванович (Кокорев, вице-премьер, – БелаПАН), вы приглашаете бедного руководителя "Славнефти" и бедного руководителя Мозырского НПЗ, еще более нищего Чесновицкого с Новополоцкого НПЗ (генеральный директор, – БелаПАН), абсолютных бедолаг – обнищали, обносились, нечего одеть – "Беларуснефть", "Дружбу" (предприятие по транспортировке нефти, – БелаПАН) и Бамбизу (президент концерна "Белнефтехим", – БелаПАН). Каждого обязываете пожертвовать для крестьян по примеру Белорусской железной дороги (БЖД выделила 10 тысяч тонн дизельного топлива, – БелаПАН) по удельному весу. Получится 15 тысяч – спасибо, получится 9 тысяч – тоже спасибо. Доложите мне до 15 мая, что эти объемы выделены. Я это не голословно говорю. Я уже поговорил с руководителями. Они говорят: какие вопросы, Александр Григорьевич, мы поможем. Вот я вам назвал субъекты, которые должны помочь. Вы их пригласите и скажите, сколько они пожертвуют нашему селу. Это будет их вклад в мою предвыборную кампанию. Я уже публично об этом говорю. Мне деньги другие не нужны. Пусть дадут моим избирателям, моим крестьянам вот эти объемы топлива. А потом доложите, кто отказался", – сказал Лукашенко.

Президент потребовал от Кокорева взять у Ивана Бамбизы список всех предприятий, поставляющих в Беларусь нефть для переработки: "Всех нагрузить. И дайте им срок до конца мая. Пусть жертвуют. Сегодня у нас в очереди люди стоят на поставки нефти. Пожертвовал – будешь работать на рынке, не пожертвовал – до свидания. Они не нищие, они не бедные. То же самое банки – "Славнефть", "Газбанк" (видимо, "Белгаспромбанк", – БелаПАН) и прочие, пока не вывезли за границу деньги, ибо потом Наумов (министр внутренних дел, – БелаПАН) будет бегать по всей Европе за ними. Так хоть возьмите у них понемножку, а то мы видим только крупные банки и те, которые сами стараются помочь. Пришли работать на нашу землю и российские банки, и другие зарубежные банки – доведите до них мою просьбу. Пока просьбу".

"Особенно, Иван Михайлович (Бамбиза, – БелаПАН), вас предупреждаю, пока мы в тюрьму не посадили некоторых ваших заместителей, которые там сынкам своим коммерческие структуры посоздавали и конвертировали валюту, они поставляли нефть. Они единственное, чем могут хоть чуть-чуть обелить себя передо мной, не перед законом пока, а передо мной, это тоже немаловажно, пусть немедленно дадут деньги крестьянам. А то вы мне тут рассказываете – нищие, бедные. Сегодня палец не воткнешь на проспектах Минска, невозможно проехать, иномарка на иномарке. Бедный народ белорусский! Бедные, нищие минчане! Так вот этих всех номера записывайте, приглашайте, и пусть помогают. А то хотят хлеба дешевенького поесть, молочных продуктов, мяса, колбасы. Так помогай, чтобы было дешевле! Чтоб у меня была информация, кто и какое участие из богатых людей принял в поддержке сельского хозяйства (...) Пожертвования со стороны всех, кто сегодня ходит, ползает, ездит на иномарках по стране", – заявил Лукашенко.

Дмитрий ВЛАСОВ

ЖУРНАЛІСТЫ ПАТРАБУЮЦЬ СПЫНІЦЬ ЦІСК УЛАДАЎ

Кіраўнікі шэрагу рэспубліканскіх і рэгіянальных недзяржаўных выданняў Беларусі падтрымалі зварот Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ), які адрасаваны органам улады, ад якой залежыць дзейнасць СМІ.

"У Беларусі ўзмацняецца ціск на незалежны друк. Найбольш пашырана сёння эканамічная дыскрымінацыя: для рэдакцый недзяржаўных газет вызначаюць заведама завышаныя тарыфы на распаўсюджванне, экспедыяванне, перасылку і дастаўку перыядычных выданняў. Гэта вынік манапольнага становішча на рынку газетных паслуг Рэспубліканскага дзяржаўнага аб'яднання "Белпошта", якое ўваходзіць у структуру Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь.

У 2000 годзе тарыфы на распаўсюджванне недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі былі амаль у пяць разоў вышэйшыя, чым на дзяржаўную прэсу. Такая негатыўная тэндэнцыя захавалася і ў 2001 годзе, хоць пад ціскам журналісцкай грамадскасці "Белпошта" змушана была зменшыць апетыты: розніца ў тарыфах складае 3,3 раза.

Па просьбе рэдакцый буйнейшых незалежных газет Цэнтр прававой абароны СМІ пры ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" падрыхтаваў іскавую заяву ў Вышэйшы гаспадарчы суд Рэспублікі Беларусь ад імя "Белорусской деловой газеты" і выданняў, што далучыліся да яе - газет "Народная воля", "Свободные новости", "Белорусский рынок". Аднак суд адмовіўся прыняць іск да разгляду на чыста фармальнай падставе - не быў захаваны дасудовы (адміністратыўны) парадак урэгулявання спрэчкі.

У выніку гэтага ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" і рэдакцыі вышэйназгаданых газет змушаны былі звярнуцца ў Міністэрства прадпрымальніцтва і інвестыцый Рэспублікі Беларусь з заявай аб прызнанні няправамоцнасці дзеянняў "Белпошты" у частцы ўсталявання тарыфаў на паслугі і прызнанні несапраўднымі рашэнні Міністэрства сувязі і Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь па рэгістрацыі згаданых тарыфаў.

Мінула больш за месяц са дня падачы заявы. У той жа час рэдакцыі як суб'екты гаспадарання нясуць істотныя страты, і іх далейшае існаванне знаходзіцца пад сур'ёзнай пагрозай.

Такую сітуацыю мы расцэньваем як грубае парушэнне арт. 13 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе ўсім роўныя правы для ажыццяўлення гаспадарчай ды іншай дзейнасці.

Зыходзячы з вышэйпададзенага, мы вымушаны звярнуцца да органаў дзяржаўнага кіравання, ад якіх залежыць рашэнне пералічаных пытанняў, з наступнымі патрабаваннямі:

1. Спыніць злоўжыванне манапольным становішчам Рэспубліканскага дзяржаўнага аб'яднання "Белпошта" пры фармаванні тарыфаў і цэн на паслугі па распаўсюджванню перыядычных выданняў.

2. Прызнаць незаконнымі рашэнні Міністэрства сувязі і Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь аб рэгістрацыі згаданых тарыфаў.

3. Стварыць умовы для свабоднага і раўнапраўнага развіцця альтэрнатыўных сістэм распаўсюджвання друкаванай прадукцыі.

Гэты зварот накіраваны таксама ў Міністэрства сувязі, Міністэрства эканомікі, Міністэрства прадпрымальніцтва і інвестыцый, Дзяржаўны камітэт па друку і дасланы Прадстаўніку АБСЕ па свабодзе сродкаў масавай інфармацыі Фраймуту Дувэ".

Тэкст прыняты на Праўленні ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" 17 красавіка 2001 г.

Да Звароту далучыліся галоўныя рэдактары наступных выданняў:

Пётр Марцаў "Белорусская деловая газета", Іосіф Сярэдзіч "Народная воля", Аляксандр Уліцёнак "Свободные новости", Вячаслаў Хадасоўскі "Белорусский рынок", Ігар Высоцкі"Белорусская газета", Аляксандр Старыкевіч "Беларускі час", Аляксандр Тамковіч "День", Віктар Івашкевіч "Рабочий", Таццяна Мельнічук "Беларуская маладзёжная", Юлія Слуцкая Комсомольская правда в Белоруссии", Мікалай Маркевіч "Погоня" (г.Гродна), Ігар Ірхо "Де-факто" (г.Магілёў), Роман Улан "Новая газета Сморгони" (г. Смаргонь), Уладзімір Янукевіч "Intex-Press" (г.Баранавічы), Лідзія Цалуйка "Для Вас" (г.Івацэвічы), Віктар Валадашчук "Газета Слонімская" (г. Слонім), Мікалай Аляксандраў "Брестский курьер" (г.Брэст), Уладзімір Вярбовікаў "Гомельская думка" (г.Гомель), Віктар Мурылёў "Солидарность" (г.Салігорск), Алена Раўбецкая "Биржа информации" (г.Гродна), Сяргей Няроўны "Вольны горад" (г. Крычаў), Андрэй Вышынскі "Інформ-прогулка" (г.Лунінец), Генадзь Суднік "Тыднёвік Магілёўскі" (г.Магілёў), Яўген Агурцоў "Гражданская газета", Павел Жук "Наша свобода", Анатоль Букас "Борисовские новости" (г.Барысаў), Анджэй Дубікоўскі "Глос з-над Нёмна" (г.Гродна), Станіслаў Суднік "Наша слова" (г.Ліда), Генадзь Ешчанка "Новая борисовская газета" (г.Барысаў), Мікалай Худаешка "Новый Лукомль" (г.Новалукомль), Анатоль Вайцехоўскі "Шаг" (г.Баранавічы).

ЗНІКАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ВЯДОМЫЯ ЛЮДЗІ

Пытанні "Дзе Завадскі, Ганчар, Захаранка?" можна прачытаць у газетах, а таксама на будынках ці платах у Слоніме. Прамых адказаў на іх няма. Знікненне вядомых палітыкаў і журналістаў у нашай краіне — трагічная прыкмета часу. Але знікаюць не толькі вядомыя людзі.

Памятаю, як у 80-ыя гады вялікі грамадскі рэзананс выклікала знікненне адной слонімскай школьніцы. Дзяўчынка пайшла з сяброўкамі ў кіно і дамоў не вярнулася. Пошукі поспеху не прынеслі. У тыя часы такое здаралася не часта. Пад юрыдычны тэрмін "без вестак адсутнічае" траплялі адзінкі.

Але часы мяняюцца. Нядаўна ў слонімскім судзе разглядалася заява маладой жанчыны аб прызнанні без вестак адсутнічаючым яе мужа. Са слоў жанчыны вынікае наступнае. Муж пазваніў і сказаў, што едзе ў камандзіроўку. Калі жонка вярнулася з працы дамоў, то не знайшла на месцы большасці яго асабістых рэчаў. Суседка расказала, што мужчына загрузіў у сваю легкавушку рэчы і з'ехаў. Гэта здарылася ў мінулым годзе. Высветлілася, што на працы яго ў камандзіроўку тады ніхто не пасылаў, і да гэтай пары пра яго няма ніякіх звестак. Тым больш у такой справе цяжка вызначыць матывы ўчынку чалавека. А жанчына з сынам засталася фактычна без мужа. І цяпер ёй патрэбна скасаваць шлюб, каб атрымліваць ад дзяржавы адрасную дапамогу на дзіця. Вось і чакае жанчына рашэння суда, што яе муж сапраўды без вестак адсутнічае. Бо менавіта пасля гэтага блізкія сваякі набываюць права апекаваць маёмасцю зніклага. Напрыклад, у мінулым годзе разглядалася пяць падобных спраў. Аднак, бывае і выключэнне. Так пасля знікнення тазней адна жанчына аб'явілася. Збегшы ад сваіх дзяцей і мужа, яна гасцявала ў блізкім замежжы, адкуль прывезла... яшчэ адно дзіця. Як аказалася, маці гэтай жанчыны праз суд дамагалася прызнання дачкі без вестак адсутнічаючай, а на самай справе, як стала вядома, сама перамаўлялася з ёй па тэлефоне. У такім выпадку заканадаўства прадугледжвае юрыдычную адказнасць абодвух бакоў. І тым не менш, як паказвае практыка, некаторыя людзі самі жадаюць знікнуць бясследна.

Мікола КАНАНОВІЧ

У СЛОНІМСКІМ КІНАТЭАТРЫ — прэм'ера фільма "У жніўні 44-га..."

Завяршылася праца над фільмам "У жніўні 44-га..." па раману Багамолава "Момант ісціны", які здымаўся ў Слоніме ў 1999 годзе. Спачатку меркавалася, што яго прэм'ера адбудзецца 9 траўня 2000 года, пасля гэтыя тэрміны пераносіліся на 22 чэрвеня і 3 ліпеня.



І вось 28 красавіка 2001 года гэты фільм будзе дэманстравацца ў слонімскім кінатэатры "Мір". На прэм'еры будзе прысутнічаць рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Пташук, аператар Уладзімір Спорышаў.

Фільм "У жніўні 44-га..." на VII кінафестывалі краін садружнасці Незалежных дзяржаў і Балтыі "Лістапад 2000" атрымаў спецыяльны дыплом журы гледачоў "Серабро "Лістапада", спецыяльны дыплом журы кінематаграфістаў за лепшую аператарскую працу і спецыяльны дыплом журы кінапрэсы "За другую ролю, якая стала першай" акцёру Уладзіславу Галкіну.

"У жніўні 44-га..." - гэта ваеннапрыгодніцкая балада аб салдатах-контрразведчыках, якія змагаліся з нямецкімі дыверсантамі. У галоўных ролях: Яўген Міронаў, Уладзіслаў Галкін, Беата Тышкевіч.

Кінатэатр "Мір" запрашае ўсіх жадаючых 28 красавіка (сеансы ў 15.00, 17.00, 19.00, 21.00) на прэм'еру гэтага фільма, які будзе транслiравацца па 6 траўня.

на жыццёвых скрыжаваннях

Францішка Стаханаўка



Малюнак Яўгена Іванова

Над вёскай разлівалася летняя спёка: на небе ні хмурынкі, у полі ні вятрынкі. Здавалася, што ўсё жывое пахавалася ў цянёк, і толькі адзінокая баба Міхаліна, хатка якой стаяла акурат пасярод вёскі, нястомна тыркаючы ў пыл свой адпаліраваны кіёк, тупала ў напрамку магазіна. Суседскі хлопчык сказаў ёй, што туды неўзабаве павінны прывезці хлеб і там ужо сабралася чарга. Але не толькі патрэба ў хлебе гнала Міхаліну з дому. Яна несла навіну, якую ў вёсцы ведалі лічаныя людзі: толькі што сканала яе суседка Францішка-Стаханаўка. Міхаліна паволі падышла да групы жанчын, што сядзелі на мураве, у цяньку старога клёна і, выцершы сухою далонню запалыя вусны, прамовіла:

